*Міхась Болсун*



***

Месяц зоры збірае на веча.
Ноч на лодцы яго прыплыве.
Сож малітву вячэрнюю шэпча,
Адбівае паклоны траве,
Што прыбегла вясною пагрэцца
І жыве ля гаючай вады.
Салаўі шчодра радуюць сэрца,
Ль'юцца спеваў каленцы-лады.
Адзінокі ліхтар жоўтай бэрай
Ля прычалу павіс угары.
Хвалі шчыра цалуюць свой бераг
Покуль барва не ўспыхне зары.
Сож тады скіне коўдру туману.
Ранак мыцца сюды прыбяжыць.
Першы промень стралою зламанай
Згубіць след у падводнай цішы.

***

Чорным болем Чарнобыль
Уварваўся ў наш лёс,
Неспакою мікробы
Нам у сэрцы занёс.

І пытанні кручкамі
Колькі год тут вісяць:
А што будзе тут з намі,
Будуць мо высяляць?

У лес не пойдзеш –
Там цэзій,
Дровы нельга паліць.
І кароў усё меней
Сёння гоняць даіць.

Усё турботы, турботы –
Ад сяла да сяла.
Колькі лішняй работы
Нам нядбайнасць дала?!

***

Зноў журбою на струнах дажджоў
Зацягнулася восені песня,
І на крылах кліны жураўлёў
Радасць цёплую ў вырай панеслі.

І звіняць звонкай меддзю лісты
Па-над сцежкамі ў вальсе апошнім,
А туман абдымае густы
Схаладнелую, рыжую пожню.

І зайздросціць кастрам пастухоў,
Дзе пахучая бульба пячэцца
Нават сонца. Яно раніцой
І не супраць само пагрэцца.

## Пачуцці

Над чыстым аркушам паперы
Радкі выспельваю ў цішы,
У іх любоў, надзея, вера —
Пачуцці светлыя душы.
Любоў да злосных не прыходзіць,
Крычаць аб ёй — сабе назло.
Даўно прыкмечана ў народзе,
Дзе ёсць любоў — не трэба слоў.
Калі ж лёс нечым і абдзеліць,
Забуду тое, што было.
Заззяюць іскаркі надзеі,
Апошнім гасне іх святло.
Душа пустэльная без веры,
Казала мама: «З ёй жыві»
...Я адчыняю насцеж дзверы
Надзеі, веры і любві.

***

Над Чачэрскам развеяўся золак,
Над ім звонкая, крохкая ціш.
Атухаюць агеньчыкі зорак.
Залаціцца царквы ярка крыж.

А бадзяга-туман зноў мярэжай
Лёг сушыцца на вецце кустоў.
Парк на Замкавай, ратушы вежы
Ранак барвай фарбуе густой.

З дрэў сцякаюць нячутна расінкі.
Лозы сонна глядзяць у раку.
А з усходу, з суседняй Расіі
Паказала ўжо сонца шчаку.

Гэты міг зноў пачуцці разбудзіць,
Сум дрымотны я з сэрца ганю.
П'ю жадобна, на поўныя грудзі,
Горад родны, тваю цішыню.

## Дождж

Пад музыку вясёлую дажджу
І буркатню не злую грому





З душы змываю хутка стому,
На свет вачмі ўлюблёнымі гляджу.

Вясёлкі каляровая дуга
Ажно звініць высока ў небе.
І ніва пахне востра хлебам,
І лета дух хаваецца ў стагах.

...Дажджынкі дапівае ўсмак зямля,
І зноў прадуць нябёсы промні,
Я ж кожны міг хачу запомніць,
І гэту свежасць выпіць спакваля.

## Асеннія матыў

Вецер грае без смычка і нотаў.
Сум панеслі ў вырай жураўлі.
Залатыя ордэны лістоты
Уручае восень зноў зямлі.
Дождж прышпіліць тыя ўзнагароды —
Зажаўцеюць сцежкі навакол,
А надыдзе волкая пагода,
Слёзы пусцяць шыбіны вакон.
Гракавым крылом блішчаць барозны —
Зябліць трактар тлустыя пласты
Покуль не абдыме вечар позні
Край туманам золкім і густым.

## Лес

О лес, крылом зялёным ахіні!
Прыйшоў к табе,
бы ў храм, на споведзь,
Гаючай пакланіцца цішыні,
Душой адчуць з прыродай повязь.

Маліцца буду я тваёй красе.
Знайду радок пад кронаў пошум,
І памяць у маленства аднясе,
Калі дарыў грыбоў ты кошык.

Рубінавыя пацеркі суніц
Ссыпаў рупліва ў гарлачык.
Адкрыў тады нямала таямніц,
Такіх нідзе я больш не бачыў.

Зачаравала лесу прыгажосць,
Не месца ў ім маркоце-скрусе.
Шчаслівы я, што твой сягоння госць
І сцежкай зноў грыбной прайдуся.

## Гарлачык

У затоцы зялёная ціш.
Промень падае з неба гарачы.

Зачарована доўга глядзіш
На цудоўную кветку – гарлачык.

Качанём-птушанём на лісце
Прымасціўся, нібы на далоні,
Хоча ўверх, ды не можа ўзляцець –
Глыбіня сцябло цемрай палоніць.

На зялёным сядзіць ланцугу,
Сонца промні лакатарам ловіць,
І стракозы яго берагуць –
Шэпчуць штосьці на ціхай іх мове.

У Чырвонай ёсць кнізе радок
Пра гарлачык. І гэта трывожыць...
...Кіну ўсё і – у Чачэрск-гарадок,
Дзе гарлачыкаў россып на Сожы.